*РЭХА ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА-81*

# РАДОК У СЛАЎНЫ ЛЕТАПІС

Школа працоўнага семестра для кожнага, хто яе прайшоў, стала і школай грамадзянскага сталення, маральнай загартоўкі, фізічнага ўдасканалення. Юнакі і дзяўчаты ў куртках байцоў СБА, якія прынялі ўдзел у першым працоўным семестры адзінаццатай пяцігодкі, могуць з гонарам сказаць, што яны апраўдалі высокае імя XXVI з'езда партыі, якое ў гэтым годзе насіць Усесаюзны студэнцкі атрад.

Байцы студэнцкага будаўнічага атрада «Нашчадкі» гісторыка-філалагічнага факультэта універсітэта ў час падрыхтоўкі да работы ў трэцім працоўным семестры прынялі сацыялістычныя абавязацельствы. У іх прадугледжвалася асвоіць 60 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, іншымі словамі правесці рэканструкцыю свінарніка ў саўгасе «Запаветы Ільіча» Петрыкаўскага раёна. У гэтых жа абавязацельствах прадугледжвалася шырока разгарнуць агітацыйна-прапагандысцкую дзейнасць, прыняць удзел у аперацыях «Абавязак», «Памяць», «Салдацкае пісьмо», узяць шэфства над ветэранамі вайны і працы, чытаць лекцыі для мясцовых жыхароў, даваць канцэрты мастацкай самадзейнасці, выпускаць насценгазету «Нашчадкі», «маланкі», «баявыя лісткі», а таксама дапамагаць працаўнікам вёскі ва ўборцы ўраджаю і нарыхтоўцы кармоў.

Пасля знаёмства з абавязацельствамі першая думка, якая прыходзіць — няўжо ўсё гэта яны змогуць выканаць! Праца на будоўлі вельмі нялёгкая, і часу пасля яе застаецца не так ужо многа. Але гэта пасля знаёмства з паперай. А пасля размовы з камісарам атрада Таццянай Котавай такая думка ўжо не турбуе. Трэба вельмі добра ведаць гэтых рабят, бачыць іх вочы, якія ззяюць задорам маладосці, каб зразумець, што ўсё гэта магчыма.

Расказвае Таццяна Котава:

— Рэканструкцыю свінарніка мы правялі на «добра». Так ацаніла нашу працу камісія, якая прыязджала з упраўлення «Саюззэфірмасла». Мы стараліся. Спачатку з'ездзілі ў калгас імя Жданава Жыткавіцкага раёна, дзе такая работа ў адным са свінарнікаў была зроблена. Гэта нам дапамагло, таму што работа сапраўды прадстаяла нялёгкая: трэба было зняць усе драўляныя часткі, пачысціць, потым паставіць металічныя канструкцыі, забетанаваць.

Былі ў нас і другія справы, якія пачыналіся ў асноўным увечары, або ў выхадныя дні. Кожная гадзіна тады набывала такую насычанасць, што мы паспявалі зрабіць многае. Рыхтавалі выступленні агітбрыгады, праводзілі дыскатэкі для мясцовай моладзі. Самымі актыўнымі ў гэтых мерапрыемствах былі Аляксандр Пермінаў і Віктар Маючый. Віктар да таго ж адзін з лепшых нашых лектараў. Яго гутаркі аб Гомелі, аб гарадскім падполлі ў час Вялікай Айчыннай вайны карысталіся заўсёды вялікай папулярнасцю.

Пазнаёміліся мы з сем'ямі тых, чые родныя аддалі сваё жыццё за Радзіму. У Еўдакіі Якаўлеўны Коль на франтах загінулі муж і тры сыны. Лідзія Аляксандраўна Сокал страціла бацьку і дзвюх сясцёр. Мы наведвалі жанчын, дапамагалі ім па гаспадарцы.

Наладзілі супрацоўніцтва з моладдзю мясцовага саўгаса: арганізавалі агульную добраахвотную народную дружыну, праводзілі спартыўныя спаборніцтвы, адкрылі кансультацыйны пункт. Дарэчы, пра яго хочацца сказаць асобна, таму што пачынанне гэтае дало свой плён. Міхаіл Сокал, які карыстаўся нашымі кансультацыямі, паступіў у Пінскі тэхнікум мяса-малочнай прамысловасці. Многія студэнты-завочнікі прыходзілі да нас за высвятленнем цяжкіх і незразумелых пытанняў кантрольных работ. Займаліся ў нас і адстаючыя вучні мясцовай школы.

Асабліва пасябравалі мы з падлеткамі, для якіх арганізавалі паўстацыянарны лагер «Спадарожнік». Разам з імі арганізоўвалі канцэрты, збіралі лекавыя травы, і ва Усесаюзны Дзень фізкультурніка правялі малую Алімпіяду. Весела прайшоў конкурс строя і песні. 25 жніўня, у дзень закрыцця лагера, запалаў вялікі развітальны касцёр, будатрадаўцы падарылі сваім новым сябрам значкі.

Штодня, пасля абеду, праходзілі невялічкія палітінфармацыі, якія звычайна праводзілі Леанід Цвыраў і Уладзімір Дземідовіч. У выхадныя дні яны наладжвалі больш поўныя і падрабязныя агляды за тыдзень.

Наш мастак Аляксандр Пермінаў афармляў насценгазету, «маланкі», «баявыя лісткі». Маляваў ён і сяброўскія шаржы, віншаванні з днём нараджэння.

Былі ў нас і асаблівыя дні — дні ўдарнай працы. Пачыналіся яны звычайна вельмі ўрачыста. Строем ішлі да месца работы, ускладвалі кветкі да помніка загінуўшым воінам. Потым праводзілі невялічкі мітынг. 14 жніўня гэта быў мітынг-пратэст супраць рашэння ўрада Амерыкі прыступіць да масавай вытворчасці нейтроннай бомбы. Зразумела, што ў такія дні мы працавалі па-асабліваму, з камсамольскім запалам. У канцы дня ўдарнай працы звычайна выходзіла «маланка», дзе называліся імёны лепшых — Рыгора Стрыжака, майстра Валерыя Галко, старшыні рэвізійнай камісіі атрада Давуда Ібрагімава, Алы Габеевай, Сяргея Іванова, Міхаіла Хацяновіча, Леаніда Цвырава.

Дапамог атрад рабочым саўгаса і ў нарыхтоўцы кармоў для грамадскага статку: у вольны ад асноўнай работы час мы нарыхтавалі 32 тоны кармоў.

На XXVI з'ездзе КПСС Леанід Ільіч Брэжнеў зазначыў: «Пра нашу моладзь заўсёды хочацца гаварыць цёпла і душэўна. Яна гэтага заслугоўвае. Савецкія дзяўчаты і юнакі з захапленнем бяруцца за самыя разнастайныя справы, патрэбныя нашаму грамадству... Наша маладая змена расце высокаідэйнай, культурнай, з добрым пачуццём новага».

Яркія старонкі ў летапіс слаўных спраў камсамола ўпісаны байцамі студэнцкіх будаўнічых атрадаў. За пяць гадоў школу ідэйнай, палітычнай і працоўнай загартоўкі ў СБА прайшло каля 3,8 мільёна чалавек. За гэты час студэнты выканалі аб'ём работ у будаўніцтве і іншых галінах народнай гаспадаркі на 7 мільярдаў рублёў. Упісалі свой радок у гэты летапіс і байцы атрада «Нашчадкі». Справы, якія яны пакінулі ў саўгасе «Запаветы Ільіча», доўга будуць помніцца людзям, будуць нагадваць ім пра вясёлых, працавітых юнакоў і дзяўчат з Гомельскага універсітэта.

І. ШАПАРАВА.

# ДРУЖНА, ЗАХАПЛЯЛЬНА

«Купалінка» — так назвалі свой сельскагаспадарчы атрад студэнткі групы БР-12 гісторыка-філалагічнага факультэта, якія працавалі на ўборцы бульбы ў калгасе «Чырвоны Кастрычнік» Жыткавіцкага раёна. Пачатак быў добры: за першыя два дні работы «купалінак» норма іх выпрацоўкі склала 130 працэнтаў. У наступныя дні яна ўзрасла да 150. Вечарам байцы збіраліся разам, падводзілі вынікі працоўнага дня, рыхтаваліся да канцэртаў мастацкай самадзейнасці, каб выступіць перад калгаснікамі. Члены рэдакцыйнай калегіі выпускалі «баявыя лісткі».

Зацяжныя дажджы не спынілі работы атрада. Дзяўчаты па-ранейшаму завіхаліся на полі. Сумаваць не было часу: калі работа на кароткі час спынялася, чулася вясёлая гаворка, звінелі песні, на тварах свяціліся ўсмешкі. Па-сапраўднаму ўдарным стаў дзень працы ў фонд салідарнасці з дзецьмі, моладдзю краін, якія змагаюцца супраць каланіялізму і расізму. Наперадзе былі Наталля Прыпуценка, Святлана Фёдарава, Алена Валчкова, Наталля Грышчанка, Любоў Банчак, Валянціна Прыгодзіч, Святлана Кацуба і іншыя. Больш за 150 тон клубняў з 24-гектарнай плошчы сабралі байцы атрада за перыяд работы ў гаспадарцы і пагрузілі на аўтамашыны 156 тон бульбы.

Важным звяном у рабоце атрада стала шэфская дапамога мясцовай школе. Дзяўчаты зрабілі два стэнды для піянерскага пакоя і аформілі кабінет беларускай мовы і літаратуры. Люба Банчак, Лена Елісеенка, Галя Цясленка і Валя Прыгодзіч сустрэліся з вучнямі і расказалі ім пра наш універсітэт, пра тое, як здавалі ўступныя экзамены і чаму вырашылі стаць філолагамі. У канцы сустрэчы Валя Прыгодзіч прачытала свае вершы.

Надоўга ў памяці байцоў атрада застанецца сустрэча з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны Адамам Міхайлавічам Шведам, Мікалаем Андрэевічам Сямёнчанкам і Максімам Пятровічам Маславым. Цікавымі былі іх расказы пра цяжкія франтавыя дарогі, пра подзвігі сяброў-аднапалчан. Яны заклікалі студэнтаў, будучых педагогаў, выхоўваць у дзяцей любоў да сацыялістычнай Айчыны, адданасць справе камунізму.







Прама ў полі ў час абедзеннага перапынку адбылася сустрэча з вядомай трактарысткай, уладальніцай прыза імя Пашы Ангелінай Надзеяй Рыгораўнай Забеліч. Яна расказала пра сваю прафесію, пра ўдзел у розных спаборніцтвах механізатараў, пра незабыўную паездку ў Маскву, дзе ёй уручылі дарагую для яе ўзнагароду.

...На канцэрт мастацкай самадзейнасці, які падрыхтавалі дзяўчаты «Купалінкі», прыйшлі калгаснікі, мясцовая моладзь. Зала вясковага клуба была перапоўнена. Удзельніцам канцэрта пасля кожнага нумара дружна апладзіравалі гледачы. Асабліва спадабаліся ім песні ў выкананні Н. Прыпуценка і Н. Грышчанка, В. Прыгодзіч, якая напісала сама частушкі на мясцовыя тэмы і выканала іх разам Л. Жарынай. Звінелі песні, гучалі вершы, ставіліся сцэнкі...

Праводзіць байцоў атрада прыйшлі многія калгаснікі. Яны запрашалі дзяўчат прыязджаць у іх гаспадарку і на наступны год.

На развітанне свяціліся ўсмешкі, гучалі песні.

А. СОЛАХАЎ,
камандзір атрада, аспірант кафедры беларускай мовы.

НА ЗДЫМКАХ: 1. На ўборцы бульбы студэнты працавалі па-ўдарнаму. 2. Надоўга запамятаецца сустрэча з ветэранамі вайны. 3. Хвалюючым было расставанне з сельскімі працаўнікамі.

Фота аўтара.

# ЭФЕКТ ДЫПЛОМА

Эканамістаў называюць штурманамі вытворчасці. Яны пракладваюць шлях, якім пойдзе развіццё прадпрыемства, аб'яднання або цэлай галіны народнай гаспадаркі.

Не сакрэт, што для паспяховага авалодвання гэтай складанай справай патрэбны глыбокія прафесійныя веды і практычныя навыкі эканамічных разлікаў. Усе гэтыя якасці студэнты набываюць у ходзе вучэбна-даследчай і навуковай работы, канчатковым вынікам якой з'яўляецца падрыхтоўка рэальных дыпломных праектаў.

У мінулым навучальным годзе кожная трэцяя дыпломная работа, выкананая пад кіраўніцтвам выкладчыкаў нашай кафедры, рэкамендавана да ўкаранення ў вытворчасць. Сярод іх — даследаванне праблем ашчаднага выкарыстання рабочага часу, праведзенае студэнтам-завочнікам аддзялення эканомікі працы Ю. Я. Данешчыкам (навуковы кіраўнік — дацэнт Л. А. Салохіна) у аб'яднанні «Ваўкавыскцэменташыфер». Яго вызначае глыбокая распрацоўка рэзерваў інтэнсіўнага развіцця сучаснай эканомікі прадпрыемства і шляхоў іх выкарыстання. Укараненне ў вытворчасць рэкамендацый дыпломнай работы дазволіла аб'яднанню атрымаць эканамічны эфект, які перавышае 67 тысяч рублёў.

У дыпломе студэнткі Г. Г. Беражной (навуковы кіраўнік — дацэнт І. К. Кекіш) распрацаваны новы праект механізацыі ўліку працы і заработнай платы на аснове выкарыстання сучаснай вылічальнай тэхнікі. Арыгінальнае рашэнне праблемы адразу зацікавіла кіраўнікоў Лунінецкага завода па вырабу электрарухавікоў для сельскай гаспадаркі. Рацыяналізацыя бухгалтарскага ўліку забяспечыла прадпрыемству эканамічны эфект у суме 6268 рублёў.

XXVI з'езд КПСС паставіў задачу далейшага ўзмацнення сувязі навукі з вытворчасцю. Рэальнае дыпломнае праектаванне — адзін з напрамкаў яе вырашэння.

**А. ЖУК,**
**загадчык кафедры уліку і статыстыкі, дацэнт.**

*Пашыраць дзяржаўнае страхаванне*

# ВЫГАДНА ГРАМАДЗЯНАМ І КРАІНЕ

Ва ўмацаванні эканомікі нашай краіны значную ролю адыгрывае сістэма дзяржаўнага страхавання. Яго прынцыпы былі распрацаваны У. І. Леніным і ўсё ў больш шырокіх маштабах укараняюцца ў жыццё, садзейнічаюць няўхільнаму павышэнню дабрабыту савецкіх людзей.

Аб важнасці дзяржаўнага страхавання на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва дзелавая размова ішла нядаўна на сходзе партыйнага, савецкага, прафсаюзнага і страхавога актыву Цэнтральнага раёна г. Гомеля.

Уступным словам сход адкрыў старшыня выканкома райсавета народных дэпутатаў М. В. Краўцоў.

З дакладам «Аб стане і мерах па далейшаму развіццю дзяржаўнага страхавання ў раёне» выступіў в. а. старшыні раённага Савета садзейнічання Дзяржстраху В. В. Лягчылін. Ён адзначыў, што за гады дзесятай пяцігодкі ў развіцці добраахвотнага страхавання сярод насельніцтва Цэнтральнага раёна дасягнуты пэўныя поспехі. Аб гэтым засведчылі прыведзеныя дакладчыкам лічбы. У раёне ўжо ёсць шэраг прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, дзе існуючымі відамі страхавання ахоплена пераважная большасць рабочых, служачых, інжынерна-тэхнічных работнікаў. Разам з тым адзначалася, што асобныя кіраўнікі, прафсаюзныя камітэты мала ўдзяляюць увагі добраахвотнаму страхаванню, не аказваюць належнай дапамогі страхавым работнікам.

У дакладзе падкрэслівалася, што дзяржаўнае страхаванне служыць выключна інтарэсам працоўных і таму пытанням яго далейшага развіцця павінна аказвацца ўсямернае садзейнічанне.

Асаблівай папулярнасцю ў працоўных карыстаецца асабістае страхаванне, мэта якога — дадатковае матэрыяльнае забеспячэнне застрахаванага і яго сям'і пры наступленні пэўных падзей, прадугледжаных дагаворам страхавання. Так, на канец другога квартала бягучага года ў Цэнтральным раёне налічваўся 34051 дагавор па змешанаму страхаванню. Гэта азначае, што ім было ахоплена 45,5 працэнта ўсяго працаздольнага насельніцтва раёна. Аднак ёсць усе магчымасці значна павысіць гэты паказчык. Аб наяўных рэзервах было падрабязна сказана ў дакладзе. Адначасова ўказвалася на істотныя недахопы, безадказнасць асобных работнікаў і служб, якія не спрыяюць далейшаму развіццю дзяржаўнага страхавання.

Далей дакладчык назваў прозвішчы лепшых работнікаў раённай інспекцыі Дзяржстраха, яе грамадскіх актывістаў. Дзякуючы іх намаганням па выніках сацыялістычнага спаборніцтва раёнаў і гарадоў вобласці за другі квартал бягучага года пастановай аблвыканкома і прэзідыума аблсаўпрофа калектыву інспекцыі Дзяржстраха Цэнтральнага раёна прысуджана трэцяе месца.

Па плану на 1981 год прадугледжана паступленне страхавых плацяжоў па Цэнтральнаму раёну ў суме 3160,3 тыс. руб., у тым ліку па добраахвотных відах страхавання ў насельніцтва — 3085,9 тыс. руб. Імкнучыся справай адказваць на рашэнні XXVI з'езда КПСС і ў гонар 60-годдзя Дзяржстраха ў СССР, якое адзначалася 6-га кастрычніка г. г., работнікі раённай інспекцыі Дзяржстраха пераглядзелі раней прынятыя і ўзялі на сябе павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы. У першым годзе адзінаццатай пяцігодкі вырашана даць звышпланавых паступленняў страхавых плацяжоў не менш як 135 тыс. руб.

На сходзе з вялікай увагай было выслухана выступленне начальніка інспекцыі Дзяржстраха Цэнтральнага раёна Л. Д. Сцепанцова. Ён прааналізаваў дзейнасць работнікаў інспекцыі і яе грамадскіх актывістаў, выказаў упэўненасць, што яны зробяць усё магчымае, каб з поспехам ажыццяўляць задачы, якія пастаўлены перад Дзяржстрахам у СССР на XXVI з'ездзе КПСС.

Пры абмене вопытам па арганізацыі дзяржаўнага добраахвотнага страхавання выступілі дырэктар завода «Камунальнік» М. П. Стахейка, старшыня Савета садзейнічання Дзяржстраху вытворчага аб'яднання «Гомельтрыкатажбыт» Л. І. Гранат, старшыня фабкома фабрыкі «8 Сакавіка» В. І. Зацэпа, агент інспекцыі Дзяржстраха Цэнтральнага раёна Г. І. Пастухова.

На сходзе як у дакладзе, так і ў выступленні Г. І. Пастуховай, адзначалася станоўчая работа па развіццю ўсіх відаў добраахвотнага страхавання, якая праводзіцца ў нашым універсітэце Саветам садзейнічання Дзяржстраху на чале са старшынёй прафкома Н. І. Колтышавай. У прыватнасці, гаварылася аб тым, што ў ГДУ па змешанаму страхаванню жыцця заключаны дагаворы з 64,4 працэнта выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Кожны студэнт універсітэта застрахаваны на выплату дапамогі пры няшчасным выпадку. У гэтым, заўважыла страхагент Г. І. Пастухова, вялікая заслуга не толькі членаў Савета садзейнічання Дзяржстраху, але і ўсіх дэканатаў факультэтаў універсітэта.

Удзельнікі сходу партыйнага, савецкага, прафсаюзнага і страхавога актыву прынялі Зварот да ўсіх працоўных Цэнтральнага раёна.

# ЗВАРОТ

## УДЗЕЛЬНІКАЎ СХОДУ ПАРТЫЙНАГА, САВЕЦКАГА, ПРАФСАЮЗНАГА І СТРАХАВОГА АКТЫВУ ДА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ ЦЭНТРАЛЬНАГА РАЁНА ГОРАДА ГОМЕЛЯ

**Дарагія таварышы! Імкнучыся справай адказаць на рашэнні XXVI з'езда КПСС і Пастанову ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за паспяховае выкананне заданняў адзінаццатай пяцігодкі», работнікі інспекцыі Дзяржстраха Цэнтральнага раёна пад кіраўніцтвам партыйных і савецкіх органаў, абапіраючыся на дапамогу грамадскасці, у бягучым годзе правялі значную работу па выкананню планавых заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў, далейшаму развіццю ўсіх відаў добраахвотнага страхавання сярод насельніцтва. Па выніках работы за другі квартал 1981 года раёну прысуджана трэцяе месца ў сацыялістычным спаборніцтве раёнаў і гарадоў вобласці па далейшаму развіццю дзяржаўнага страхавання.**

**У першым паўгоддзі па ўсіх відах добраахвотнага маёмаснага і асабістага страхавання насельніцтву раёна выплачана страхавых сум і страхавой кампенсацыі 1 мільён 20 тысяч рублёў, у тым ліку па жыццю — 9 тысяч рублёў. За мінулыя 9 месяцаў паступіла адлічэнняў ад страхавых плацяжоў у бюджэт раёна 62,5 тысячы рублёў.**

**Зараз з працоўнымі раёна заключана больш 60 тысяч дагавораў добраахвотнага маёмаснага і асабістага страхавання. Дагаворы па страхаванню жыцця маюць 45,5 працэнта працаздольнага насельніцтва раёна, ад няшчасных выпадкаў — 26 працэнтаў. Аднак па ўзроўню развіцця страхавання пабудоў, хатняй маёмасці раён адстае ад сярэднеабласных паказчыкаў, а па страхаванню жыцця — ад іншых гарадоў і раёнаў гарадскога тыпу вобласці.**

**Лічым, што для далейшага развіцця ўсіх відаў добраахвотнага страхавання насельніцтва ёсць значныя рэзервы і магчымасці. Да канца 1981 года неабходна павысіць узровень развіцця добраахвотнага страхавання пабудоў з 27 працэнтаў да 32, хатняй маёмасці — з 25 працэнтаў да 26,5, жыцця — з 45,5 працэнта да 48.**

**Для паспяховага вырашэння гэтых задач неабходна яшчэ шырэй разгортваць растлумачальную работу сярод насельніцтва аб значэнні і выгаднасці дзяржаўнага страхавання, выкарыстоўваць для гэтага ўсе сродкі масавай прапаганды, дабіцца рэзкага павелічэння актыўнасці страхавой грамадскасці ў гэтай важнай справе.**

**Мы, удзельнікі раённага сходу актыву страхавых работнікаў, сваім асабістым удзелам павысім узровень страхавой работы ў сваіх калектывах шляхам шырокага разгортвання масава-растлумачальнай работы сярод рабочых і служачых з тым, каб кожная сям'я, кожны член нашага калектыву меў дагавор добраахвотнага страхавання.**

**Зварот прыняты ўдзельнікамі раённага сходу актыву.**

# ДЛЯ АМАТАРАЎ КІНО

Беларускае аддзяленне Бюро прапаганды савецкага кінамастацтва запрашае аматараў кіно (спадзяемся, што іх нямала і сярод студэнтаў нашага універсітэта) прыняць удзел у рабоце кінауніверсітэта «Кінамастацтва нашых дзён».

У мінулым сезоне слухачы кінауніверсітэта сталі ўдзельнікамі сустрэч з папулярнымі акцёрамі савецкага кіно Ларысай Лужынай, Маяй Булгакавай, Уладзімірам Івашовым, выканаўцам ролі легендарнага Камо Гургенам Тонунцам, камедыйнай актрысай Наталляй Крачкоўскай, Маргарытай Валодзінай і інш. Пазнаёміліся з кіназнаўцамі і крытыкамі, запрошанымі з Масквы, Рыгі, Мінска.

У праграму новага сезона ўваходзяць тры выступленні вядомых артыстаў кіно, творчая сустрэча з рэжысёрам-пастаноўшчыкам, прэм'ера новага фільма, тры кіналекцыі па пытаннях замежнага кінамастацтва і 8 вечароў, прысвечаных праблемам савецкага кінематографа.

Заняткі кінауніверсітэта дапамогуць лепш разабрацца ў складаных праблемах сусветнага кінематографа, навучыцца адрозніваць сапраўды добрыя фільмы ад пасрэдных, паглядзець новыя стужкі студыі «Беларусьфільм», пазнаёміцца з выдатнымі майстрамі савецкага кіно, атрымаць уяўленне аб стылях і напрамках у замежным кінамастацтве.

Усе кіналекцыі суправаджаюцца тэматычным паказам фрагментаў мастацкага фільма савецкай або замежнай вытворчасці. Сустрэчы з акцёрамі ілюструюцца фрагментамі з удзелам выступаючых.

Заняткі праводзяцца 2 разы ў месяц.

Абанементы кінауніверсітэта можна набыць у прафкоме ГДУ. Кошт — 5 руб. 60 кап.

**В. СЕНІНА,**
**намеснік старшыні прафкома ГДУ.**

# ЦЫКЛ ЛЕКЦЫЙ АБ РЭЛІГІІ

У гэтым годзе таварыства «Веды» арганізуе для сваіх членаў, для ўсіх жадаючых цыкл лекцый «Рэлігія ў сучасным свеце». Адкрыецца цыкл лекцыяй «Ідэалагічная барацьба і рэлігія». Затым будуць прачытаны лекцыі «Сацыялістычная дзяржава і царква», «Моладзь і рэлігія», «Праваслаўе ў мінулым і цяпер», «Хрысціянскія секты ў СССР», «Нацыянальныя традыцыі і рэлігія», «Гісторыя папства і сучасны каталіцызм», «Іслам у грамадска - палітычным жыцці замежнага Усходу».

З лекцыямі выступяць навуковыя супрацоўнікі музея гісторыі рэлігіі і атэізму з Ленінграда.

**(Наш кар.).**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Дэканат, прафсаюзнае бюро фізічнага факультэта і калектыў кафедры оптыкі выказваюць глыбокае спачуванне старшаму навуковаму супрацоўніку СЫЦЬКО Уладзіміру Уладзіміравічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БАЦЬКІ.**

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета ЛКСМБ и профкома Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 2 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 56-16-52.
АЗ 50647
Заказ 5519